УДК 001.4:37(100)(476)

В.У. Русак

# ПАНЯЦЦЕ «ПЕДАГАГІЧНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ» Ў ЗАМЕЖНАЙ І АЙЧЫННАЙ НАВУКОВАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Практыка выкарыстання тэрміна *педагагічныя тэхналогіі* (далей *ПТ*) ілюструе, што сёння ён ужываецца ў дачыненні да вельмі разнастайных з’яў навучання і выхавання. Значыць ёсць неабходнасць асвятлення дыскусійных аспектаў названага навуковага паняцця, вызначэння, з якім семантычным напаўненнем зафіксаваны гэты тэрмін у літаратуры, высвятлення таго, чым выклікана і наколькі навукова апраўдана яго полісемантычнасць.

Тэрмін *ПТ* зарадзіўся ў 70-ыя гады XX ст. у ЗША і першапачаткова суадносіўся з ідэяй тэхналагізацыі вучэбнага працэсу. Заходнія педагогі сфармулявалі ўстаноўку пра магчымасць поўнасцю кіраваць працэсам навучання пры ўмове, што ўся дзейнасць педагога прадстаўлена ў пэўнай паслядоўнасці і цэласнасці, а выкананне кожнага крока звязана з абавязковым дасягненнем пэўнага выніку, які паддаецца прагназаванню. Былі вылучаны такія крытэрыі тэхналагічнасці, як канцэптуальнасць, працэсуальнасць, кіруемасць, узнаўляльнасць, прадуктыўнасць.

На сучасным этапе паняцце *ПТ* стала ўжывацца больш шырока, нават для тых сітуацый, дзе ўзнаўляльнасць адукацыйнага працэсу ў аднатыпных умовах і яго прагназуемасць ускладнены ці ўвогуле немагчымыя. Такая тэнцэнцыя, на думку прафесара Піонавай Р. С., з’яўляецца вынікам змяшэння тэрмінаў *тэхналогія*, *тып навучання, канцэпцыя, сістэма, метад*. Нямала спрэчных пытанняў выклікае мэтазгоднасць выкарыстання паняцця *ПТ* у дачыненні да выхаваўчага працэсу. У выхаванні не можа быць абсталявання і бездакорнай дыягностыкі для вызначэння вынікаў ўздзеяння. Як адзначае доктар педагагічных навук М. В. Кларын, у заходняй педагогіцы тэрмін *ПТ* абмежаваны сферай навучання. Аднак у айчыннай педагагічнай практыцы паняцце *выхаваўчай тэхналогіі* існуе. Яго прыхільнікі супраціўляюцца жорсткай трактоўцы і лічаць карэктным распрацоўваць і ўкараняць *ПТ* для вырашэння праблем выхавання.

Тэрміналагічныя недакладнасці – з’ява натуральная для пачатковага этапа асэнсавання навуковай праблемы, а таму перад педагогамі-практыкамі і тэарэтыкамі сёння стаіць задача удакладніць статус катэгорыі *ПТ*, выключыць дыяметральна супрацьлеглыя тлумачэнні гэтага тэрміна, вызначыць ступень дапусцімасці творчасці пры выкарыстанні *ПТ*.